# УРАДЖАЙ У ЛЕТНІМ САДЗЕ ПАЭЗІІ

**Людзей з розным багажом жыццёвага вопыту, з рознымі тэмпераментам, густамі і поглядамі на жыццё аб’яднаў новы праект галоўнай бібліятэкі Прынёмання. Нядаўна ў яе летнім садзе выступілі маладыя гродзенскія паэты. Гучала лірыка на беларускай і рускай мовах. На спатканне з мастацкім словам Гродзеншчыны прыйшлі прадстаўнікі культурнай грамадскасці горада над Нёманам, чытачы і бібліятэкары, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, ветэраны працы, грамадскія актывісты.**

Пры задумцы чарговай літаратурнай сустрэчы яе арганізатары – абласная бібліятэка (дырэктар Марына Ігнатовіч) і Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі – стараліся аб'яднаць у адным сімвалічным букеце некалькі дэталяў: матыў лета, вобраз пладовага саду, а таксама творчасць маладых паэтаў. Канструкцыя атрымалася змястоўнай і каларытнай. Сустрэча пад назвай «Ёсць нешта прыгожае ў леце…» прайшла несумна, дынамічна і падарыла людзям шмат новых уражанняў.

…Вікторыя Смолка. Творчая свядомасць дзяўчыны населеная яркімі вобразамі з двух светаў: паўсядзённага і духоўнага. Слова маладой беларускай паэткі, члена СПБ, льецца, як празрысты светлы ручай. …Мікіта Валько – сакратар літаратурнага клуба «Катарсіс» пры Гродзенскім медыцынскім універсітэце. Выкладае медыцыну, цікавіцца сусветным мастацтвам. …Арцём Гоман толькі скончыў сярэднюю школу № 28 г. Гродна. Таксама сапраўдны малады інтэлектуал. Хлопец прачытаў уласныя вершы на роднай мове. …Кацярына Ігнацюк – лаўрэат IV абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі ў намінацыі «Адкрыццё года». Цікавіцца псіхалогіяй, займаецца парашутным спортам. …Анастасія Самушчык прадстаўляе Ваўкавышчыну. Перад тым, як стаць гарадзенкай, узначальвала Ваўкавыскае раённае літаб’яднанне «Муза». Піша вершы па-руску і па-беларуску. …Юлія Мельнік выступіла са сваей грамадзянскай лірыкай. …Член СПБ, празаік, паэтэса Таццяна Лашук прачытала беларускія вершы з элементамі мадэрнізму. Цікава, што эстафету прыняла дачка пісьменніцы, 8-гадовая Ганначка, з уласным вершам… Ураджай маладой гродзенскай паэзіі лета-2022 – вынік сумеснай працы прадстаўнікоў розных пакаленняў.

У фінале мерапрыемства са сваімі рэфлексіямі выступілі член СПБкандыдат гістарычных навук, публіцыст-гісторык Уладзімір Ягорычаў; заслужаны работнік адукацыі Беларусі, ветэран педагагічнай працы, грамадскі дзеяч Ларыса Хацько; член СПБ, паэт Анатоль Апанасевіч; экалагічны і грамадскі актывіст, культурны дзеяч Тэрэза Белавусава. Не абышлося без заўваг, але не крытычных, а па-бацькоўску добрых і карысных. Ёсць спадзяванне, што літаратурныя сустрэчы ў такім месцы стануць традыцыяй.

**Дзмітрый РАДЗІВОНЧЫК**

«Літаратура і мастацтва» № 32 12 жніўня 2022

